мена язычества существовал обряд сжигания соломенного чучела, люди пекли блины, просили у предков плодородного года, провожали зиму. Прошло время, грустный праздник превратился в разудалую ярмарку. Смысл изменился, а традиция печь блины осталась, появились различные развлечения, представления. В Туркменистане русские люди целую неделю отмечают Масленицу, ходят друг к другу в гости, зовут «зятя на блины». Особенно любит этот праздник молодежь. На Пасху и сейчас, как и в давние времена, принято печь куличи, красить яйца, принимать гостей. Крашеные яйца — символизируют капли крови Иисуса Христа, распятого на кресте. В день Пасхи люди, встречаясь, говорят друг другу «Христос Воскресе» — «Воистину воскрес», троекратно целуются и обмениваются пасхальными яйцами. Тем не менее, на современном этапе развития многие культуры, даже с ярко выраженной национальной спецификой, сталкиваются с внешними и внутренними трудностями.

**Заключение.** Современный мир живет в состоянии мультикультурности, процессов глобализации, миграций. Происходит смешивание культур, поэтому существует проблема сохранения обычаев, самобытности, национальных традиций. Путь игнорирования, неприятия всего «чужого», не является адекватным ответом на вызовы мультикультурности.

«Чистая» национальная культура в современном обществе невозможна, она постоянно сочетается и пересекается с другими культурами. Глобализация пытается уничтожить все самобытные традиции, нормы, национальные интересы. Но чем сильнее происходит процесс влияния потребительской экспансии проамериканского типа, тем сильнее в последние годы поиск идентичности, возвращения духовных ценностей в национальные общества.

**Список цитируемых источников**


1. *Кирюшин, Ю. В.* Традиционные культуры Алтая / Ю. В. Кирюшин // Актуальные вопросы истории Сибири : Третьи науч. чтения памяти профессора А. П. Бородавкина, 5—6 окт. 2001 г. / АлтГУ ; РАН, СО, Ин-т истории ; отв. ред.: Ю. Ф. Кирюшин, В. А. Скубневский. — Барнаул : Изд-во АлтГУ, 2002. — 480 с.
2. Краеведческий портал [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://altlib.ru/ . — Дата доступа: 24.10.2020.
3. *Арутюнов, С. А.* Народы и культуры — развитие и взаимодействие / С. А. Арутюнов. — М., 1989. — 171 с.


УДК 378.016:811.161.3

**В. М. Шавель**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## ДАСЛЕДЧАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**Уводзіны.** Стан сучаснага грамадства характарызуецца небачанай раней інтэнсіфікацыяй творчай працы, выкліканай нарастаннем аб'ёму інфармацыі ва ўсіх сферах жыццядзейнасці чалавека. Якасці, неабходныя для даследчай дзейнасці, складваюцца і развіваюцца паступова як на этапе прафесіяналізацыі, так і ў працэсе самастойнай прафесійнай дзейнасці. Рашэнню гэтай задачы ў многім садзейнічае агульная даследчая накіраванасць арганізатараў педагагічнага працэсу ўстановы вышэйшай адукацыі, даследчая накіраванасць кожнага педагога, сфарміраванасць у яго якасцей даследчыка, сістэматычнае і мэтанакіраванае выкарыстанне ім сродкаў навучання, якія спрыяюць фарміраванню неабходных якасцей у будучых спецыялістаў. Таму важна прыцягнуць студэнтаў, будучых спецыялістаў, да самастойнай творчай дзейнасці, прывіць ім уменні і навыкі пошуку, збору, аналізу і абагульнення карыснай інфармацыі [1].

**Асноўная частка.** У сучасных умовах студэнты прымаюць удзел у навуковых даследаваннях двух тыпаў: вучэбных і навуковых. Па сваім характары гэтыя даследаванні носяць навукова-пазнавальны характар. Аднак яны іграюць розную ролю ў жыццядзейнасці навучальнай установы, адрозніваюцца спосабамі арганізацыі, адносінамі студэнтаў, масавасцю [2]. Значнасць вучэбных і навуковых работ вызначаецца глыбінёй праведзенага даследавання, важнасцю тэарэтычнага матэрыялу і практычных вывадаў.

Вучэбна-даследчая праца студэнтаў (курсавыя, дыпломныя работы) прадугледжана планам навучальнай установы. носіць абавязковы характар. У шэрагу выпадкаў курсавая работа становіцца раздзелам ці параграфам дыпломнай работы, дае штуршок для працягу даследавання на больш высокім узроўні.

Спецыяльна распрацаваныя курсы па падрыхтоўцы студэнтаў да напісання курсавой і дыпломнай работы ўводзяцца ў вучэбныя планы далёка не ва ўсіх навучальных установах. Таму выкладчыкі дысцыплін, прадугледжаных для абавязковага вывучэння, у працэсе арганізацыі і правядзення семінарскіх і практычных заняткаў павінны выкарыстоўваць віды працы, якія фарміруюць уменні і навыкі аналізу і сінтэзу, абагульнення, працы з навуковай літаратурай, напрыклад: афармленне літаратуры па тэме лекцыі ці практычных заняткаў; падрыхтоўка рэферата з выкарыстанне спачатку адной крыніцы, а пасля некалькіх; агляд

© Шавель В. М., 2020



Репозиторий БарГУ

літаратуры; вылучэнне ў прапанаваных крыніцах істотнага, галоўнага, другараднага; параўнанне канцэпцый; абагульненне апублікаваных вынікаў і параўнанне іх з вынікамі ўласных назіранняў і інш.

У працэсе працы над курсавой і дыпломнай работай, зместам навуковага артыкула студэнт ужо павінен прадэманстраваць уменне абгрунтоўваць актуальнасць, навізну і практычную значнасць праблемы, класіфікаваць і аналізаваць фактычны матэрыял, абагульняць назіранні над ім, рабіць вывады і інш.

Паводле характару апрацоўкі сабранага матэрыялу курсавая работа можа мець рэфератыўны і аналітычны характар, таму важным з'яўляецца ўменне адабраць, згрупаваць, сістэматызаваць матэрыял, асэнсаваць асноўныя ідэі розных даследчыкаў, аб'ектыўна і тактоўна ацаніць ужо зробленае, а таксама выказаць уласны погляд на праблему.

Курсавыя работы, якія пішуць студэнты па сучаснай беларускай літаратурнай мове, маюць аналітычны характар, патрабуюць самастойнага рашэння пастаўленай лінгвістычнай задачы. Вырашальным пры іх напісанні выступае ўменне прааналізаваць і апісаць фактычны матэрыял у абраным аспекце даследавання.

Выбар крыніц фактычнага матэрыялу вызначаецца тэмай даследавання, у залежнасці ад якой моўны матэрыял можа выбірацца з пісьмовых тэкстаў розных функцыянальных стыляў; крыніцай выбаркі могуць быць таксама слоўнікі, перыядычныя выданні і інш. Кожны прыклад фіксуецца асобна, даследуемая з'ява павінна быць паказана ў кантэксце, дастатковым для раскрыцця яе фармальных, змястоўных і функцыянальных характарыстык; вывучаемы моўны факт падкрэсліваецца.

На практычных занятках выкладчык апераджальна павінен пазнаёміць студэнтаў з метадамі збору моўнага матэрыялу. Існуе два асноўныя метады. Першы з іх вядомы як метад суцэльнай выбаркі. У гэтым выпадку аналізуецца ўвесь масіў тэксту, з якога выбіраюцца ўсе моўныя з'явы, якія ўяўляюць цікавасць для даследчыка. Другі спосаб збору матэрыялу вядомы як выбарачны метад; ён мэтазгодны пры рабоце з вялікімі па аб'ёме тэкстамі.

Фактычны матэрыял, сабраны студэнтамі, класіфікуецца з улікам лексіка-семантычнага, структурнага або функцыянальна-стылістычнага паказчыкаў. Сістэматызацыя і аналіз фактычнага матэрыялу залежыць ад задач, якія ставіць перад сабой даследчык.

Студэнты часта адчуваюць цяжкасці пры моўным афармленні сабранага тэарэтычнага і практычнага матэрыялу. Таму пры вывучэнні адпаведных тэм спецыяльных дысцыплін выкладчыку неабходна акцэнтаваць увагу на сродкі выражэння лагічных сувязей, спецыяльныя функцыянальна-сінтаксічныя сродкі сувязі, якія паказваюць:

– на паслядоўнасць развіцця думкі (*спачатку / сначала, найперш / прежде всего, затым / затем, такім чынам / таким образом, па-першае / во-первых, па-другое / во-вторых, значыць / значит і інш.)*;

– на супярэчлівыя адносіны (*аднак / однако; у той час, як / в то время, как; тым не менш / тем не менее і інш.*);

– на прычынна-выніковыя адносіны (*такім чынам / таким образом, таму / поэтому, дзякуючы гэтаму / благодаря этому, адпаведна з гэтым / соответственно этому, з прычыны гэтага/по причине этого, акрамя таго / кроме этого, да таго ж / к тому же і інш.);*

– на вынік, выснову *(такім чынам / таким образом; значыць / значит; напрыканцы адзначым / в конце обозначим; усё сказанае дазваляе зрабіць вывад / все сказанное позволяет сделать вывод; падводзячы вынікі, варта сказаць… / подводя итоги, следует сказать…)* і інш. [3].

Кожны студэнт-філолаг яшчэ да пачатку работы над навуковым артыкулам павінен усведамляць, што асноўны змест працы складае аналіз і ацэнка сабранага і прыведзенага ў сістэму матэрыялу, выяўленне характэрнага і спецыфічнага ў ім; абгрунтаванымі, доказнымі з'яўляюцца тыя палажэнні, якія вынікаюць з непасрэднага аналізу фактаў, пацвярджаюцца тыповымі, характэрнымі прыкладамі; што ў якасці ілюстрацый можа выкарыстоўвацца да дзесяці адзінак, увесь фактычны матэрыял пажадана падаць у працэнтных суадносінах, паколькі выразы тыпу «часта сустракаюцца», «шмат ужываецца», «многа разоў выкарыстаны» і т. п. не даюць дакладнага ўяўлення пра частотнасць і прадстаўленасць даследаванай моўнай з'явы.

На практычных і семінарскіх занятках неабходна сістэматычна вылучаць праз сістэму прадуманых заданняў асаблівасці, якія характарызуюць спецыфіку тэкстаў навуковага стылю:

– спецыяльная фразеалогія: устойлівыя спалучэнні для выражэння лагічных сувязей паміж часткамі выказвання (*як паказаў аналіз / как показал анализ, на падставе атрыманых даных / на основе полученных данных, рэзюмуючы сказанае / резюмируя сказанное, адгэтуль вынікае, што… / отсюда вытекает, что…* і г. д.);

– тэрміны *(камунікатыўная кампетэнтнасць, рэальны і ірэальны апавядальны сказ* і г. д.);

– наяўнасць вялікай колькасці назоўнікаў з абстрактным значэннем, аддзеяслоўных назоўнікаў (*даследаванне / исследование; апісанне / описание; разгляд / обзор; вывучэнне / изучение* і г. д.);

– адсутнасць экспрэсіі;

– адметная інфармацыйная нагрузка дзеясловаў і дзеяслоўных формаў (*разглядаецца праблема*, а не *разгледжаная праблема*);

– распаўсюджанасць аналітычных формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнанняў прыметнікаў: *найбольш значны / наиболее важный; больш шырокія / более широкие; больш складаныя / более сложные* і г. д.);

– асноўнае месца займаюць формы незакончанага трывання дзеясловаў і формы цяперашняга часу дзеясловаў;

Рэпазіторый БарДУ

– форма 1-й асобы выкарыстоўваецца, як правіла, у множным ліку для наймення сукупнасці асоб: *звернем увагу на назоўнікі / обратим внимание на существительные* ці этыкетнага абазначэння аўтара: *у нашай рабоце мы засяроджваем асноўную ўвагу… / в нашей работе мы обращаем пристальное внимание на…* і г. д.);

– распаўсюджаны ўказальныя займеннікі *гэты, той, такі*. (*гэтыя даныя служаць дастатковай падставай для… / эти данные служат основанием для…*);

– пераважаюць складаныя сказы, звязаныя складанымі падпарадкавальнымі злучнікамі (дзякуючы таму што, замест таго каб і г. д.);

– выкарыстанне ўстаўных слоў і словазлучэнняў для ўказання на крыніцу паведамлення (*па паведамленні / по сообщению; па звестках / по информации; паводле дадзеных / по данным; па нашым меркаванні / по нашему мнению* і інш.);

– аднародныя члены сказа служаць для класіфікацыі ці сістэматызацыі з'яў, прадметаў. Звязваюцца аднародныя члены часцей за ўсё бяззлучнікавай сувяззю ці пры дапамозе злучнікаў *і, не толькі — але і, а*;

– часта выкарыстоўваюцца вытворныя адыменныя прыназоўнікі (*у выніку, у адрозненне* і г. д.) [3].

Навуковы тэкст характарызуецца тым, што ў яго ўключаюцца толькі дакладныя, атрыманыя ў выніку працяглых назіранняў і навуковых эксперыментаў звесткі і факты. Гэта прадугледжвае абавязковае выкарыстанне спецыяльных тэрмінаў, пры дапамозе якіх у кароткай і лаканічнай форме даюцца разгорнутыя азначэнні і характарыстыкі навуковых фактаў, паняццяў, працэсаў, з'яў у час арганізацыі маналагічных адказаў на практычных занятках, выступленняў з дакладамі, рэфератамі.

**Заключэнне.** Якасна выкананая даследчая работа наглядна дэманструе ўзровень філалагічнай падрыхтоўкі студэнта, яго здольнасць творча мысліць, назіраць, аналізаваць і тэарэтычна інтэрпрэтаваць моўныя факты, развівае і дысцыплінуе лінгвістычнае мысленне. Паспяховае авалоданне даследчымі ўменнямі на этапе прафесіяналізацыі гарантуе правядзенне даследчай працы выпускнікамі ў перыяд самастойнай прафесійнай дзейнасці.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Мирзаянова, Л. Ф.* Формирование у студентов и учащихся качеств учителя-исследователя / Л. Ф. Мирзаянова. — Барановичи, 1999. — 185 с.
2. *Пионова, Р. С.* Педагогика высшей школы : учеб. пособие / Р. С. Пионова. — Минск: Выш. шк., 2005. — 303 с.
3. *Канцавая, Г. М.* Дыпломныя і курсавыя работы па мове : метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Г. М. Канцавая, В. М. Шавель ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранав. дзярж. ун-т. — Баранавічы : БарГУ, 2012. — 68 с.

Репозиторий БарГУ